### Па тваіх, Ільіч, запаветах

# 4. На абарону Айчыны

## АБ ЧЫМ РАСКАЗАЛА КНІГА НАРОДНАЙ СЛАВЫ



Карэнныя змены адбыліся ў вёсцы за гады калектыўнага гаспадарання. Калгасы служылі прыкладам арганізацыі новага жыцця сялян, сацыялістычнай перабудовы вёскі. Адбыліся прыкметныя сацыяльна-эканамічныя зрухі. Партыя, узначаліўшая калектыўны рух, пераканала сялянства ў перавазе калектыўнага гаспадарання на зямлі.

Калектывізацыя ў корані змяніла ўвесь уклад вясковага жыцця. Пад сельскую гаспадарку была падведзена індустрыяльная база. Для апрацоўкі глебы сталі шырока выкарыстоўвацца трактары, на ўборцы хлябоў—камбайны і іншыя сельскагаспадарчыя машыны і прылады. Зямля стала шчодра аплочваць працу хлебароба.

Вераломны напад фашысцкай Германіі на СССР парушыў мірную стваральную працу калгаснікаў. Фашысты імкліва рваліся да сэрца Радзімы—Масквы. Дзесяткі гарадоў, сотні вёсак былі разбураны ненавісным ворагам, які імкнуўся сілаю зброі і небывалых здзекаў заставіць стаць на калені савецкага чалавека і ператварыць яго ў свайго раба.

Аднак баханцы, пазнаўшыя радасць і шчасце свабоднага жыцця, як увесь савецкі народ, не жадалі пакарыцца ворагу. Каля двухсот ваеннапавінных мужчын узялі ў рукі зброю і сталі на абарону Айчыны. На розных участках фронту і ў розных падраздзяленнях змагаліся аднавяскоўцы. Кожны ўносіў свой уклад у агульную справу перамогі над ворагам. Воіны, у жорсткіх схватках стрымлівалі націск ашалелых гітлераўцаў.

Першыя няўдачы на франтах Айчыннай вайны і часовыя перамогі фашыстаў не змаглі парушыць веру салдат у канчатковую перамогу над гітлераўскай Германіяй. Нават у той час, калі фашысцкая зграя была пад сценамі Масквы і Сталінграда, калі ў смяротным кальцы знаходзіўся Ленінград, яны добра ведалі, што свабодны народ нельга пакарыць насіллем, нельга заставіць яго схіліць галаву. Многім з іх не выпала шчасце вярнуцца з перамогай дадому.

Дзесяткі баханцоў аддалі сваё жыццё за вызваленне Радзімы. Многія палі ў жорсткіх баях ў Запаляр'і, у стэпах Украіны і гарах Каўказа, у снягах Падмаскоў'я, каля сцен волжскай цвярдыні, у Прыбалтыцы і пры вызваленні Польшчы, Венгрыі, Чэхаславакіі, ва Усходняй Прусіі і на Карэльскім перашыйку, пры штурме фашысцкага логава— Берліна. Свята шануюць памяць аб загінуўшых аднавяскоўцы.

У 50 год узялі ў рукі зброю і першыя змагары за ўладу Саветаў Мікіта Сямёнавіч Аўчыннікаў, Дзяніс Якаўлевіч Касцюшкін і іх паслядоўнік Цімафей Пятровіч Казакоў, які загінуў у 1943 годзе.

Лёс кінуў былых будзёнаўцаў на будаўніцтва абаронных рубяжоў. Спачатку пад горад Казельск, адтуль пад Ржэў, Горкі. Зімою 1941 года Мікіта Аўчыннікаў трапляе ў падмаскоўны горад Уладзімір. Тут яму доручылі выконваць розныя сапёрныя работы па ўмацаванню лініі абароны, па будаўніцтву другой чыгункі вакол Масквы—аднаго з асноўных жыццёвых шляхоў, забяспечваючых горад і фронт зброяй, тэхнікай, прадуктамі харчавання, медыкаментамі.

Ветэран 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, Мікіта Сямёнавіч у 1942 годзе будуе бліндажы, доты і дзоты пад Варонежам, пад вёскай Жалезны Ключ Саратаўскай вобласці, дапамагае мясцоваму калгасу ў правядзенні розных сельскагаспадарчых работ. Пасля вызвалення Сталінграда ўдзельнічае ў аднаўленні заводаў.

Адсюль дарога сапёра пралягае да Гомеля, на подступах якога ў 1943 годзе ішлі жорсткія баі. Усе подступы да горада немцы абстрэльвалі з гармат, падвяргалі бамбёжцы. Пад адну з іх трапіў Мікіта Сямёнавіч. Кантузія, шпіталь, вяртанне ў сваю вайсковую часць, якая знаходзілася пад Старым Асколам.

Зноў работа на абаронных рубяжах, а пасля вызвалення горада Гомеля, ўзначаліў адно з падраздзяленняў на будаўніцтве чыгуначнай станцыі. Тут жа сустрэў і доўгачаканы дзень Перамогі. У пачатку верасня 1945 года Мікіту Сямёнавіча сустракалі родныя, блізкія і землякі.

Вярнуліся да родных месц Дзяніс Якаўлевіч Касцюшкін, кавалер ордэна Славы Савелій Пятровіч Масейкаў, былы мінамётчык Іван Дзям'янавіч Зубачоў — цяпер брыгадзір будаўнічай брыгады, Павел Сяргеевіч Макаранка—першы механізатар калгаса «Чырвоны маяк», першыя калектывісты Яфім Сазонавіч Крайнеў, браты Яўмен і Пётр Савасценкі і другія.

Цёпла і душэўна сустрэлі былых воінаў аднавяскоўцы. Палова вёскі яшчэ была ў папялішчах, не засталося ніводнай грамадскай пабудовы не кранутай пажарамі вайны .Амаль усе яны былі спалены немцамі. Трэба было неадкладна брацца за аднаўленне калектыўнай і асабістай гаспадарак. І гэту місію ўзяліся выконваць былыя воіны сумесна з жанчынамі, падлеткамі, састарэлымі.

З вайной і фашызмам было пакончана. Выразна аб перамозе над ворагам яшчэ ў свой час выказаў думку правадыр сусветнага пралетарыята У. І. Ленін, прадбачыўшы перамогу свабодных людзей:

«Мы перамаглі таму, што лепшыя людзі ўсяго рабочага класа і ўсяго сялянства праявілі нябачны гераізм..., здзейснілі цуды храбрасці»...

І. БАРЫСЕНКА.

**Барысенка, І.** На абарону Айчыны : аб чым расказала Кніга Народнай Славы / І. Барысенка // Шлях Кастрычніка.

*Карэнныя змены адбыліся ў вёсцы Баханы за гады калектыўнага гаспадарвання.*